№10(348) 15.03.2002 — 24.03.2002 Рэспубліканская грамадска-палітычная незалежная газета • Заснавана ў чэрвені 1994 г.

Беларуская маладзёжная

Лінія ВАШЫХ навін (017) 289-12-12, абанент 6614

TV-программы на неделю

Рукі прэч!

Справа газеты "Пагоня" — новы скандал на Беларусі. Справа, па якой рэдактара Міколу Маркевіча і рэпарцёра Паўла Мажэйку збіраюцца пасадзіць у турму на тэрмін да пяці гадоў, падобная на карыкатурны перафраз вядомай прымаўкі, якая ў савецкім варыянце гучала, як "слова — не верабей, выляціць — пасодзяць". Што за час на Беларусі і па якіх вераб'ях належыць грымнуць беларускай Фемідзе?

Слова самім "злачынцам".

Скажам "НЕ" перасследу журналістаў





Міколу Маркевічу і Паўлу Мажэйку, журналістам зачыненай гарадзенскай "Пагоні", інкрымінуюць абразу прэзідэнта. Рэпарцёрам пагражае да 5 гадоў турмы.

Мікола Маркевіч, рэдактар, абвінавачаны ў паклёпе на прэзідэнта:

— Трэба канстатаваць, што фактычна справы няма — адсутнічае факт злачынства, у якім яны нас абвінавачваюць, я маю на ўвазе паклёп. Журналісты "Пагоні", я і Павел Мажэйка, у межах той кампетэнцыі, якая нададзеная нам законам аб друку, выкарысталі свае права на свабоднае атрыманне і свабоднае распаўсюджванне даступнай нам інфармацыі.

Але пракуратура палічыла гэта за парушэнне закону, і ніякія аб'ектыўныя спробы даказаць ім, што гэта не так, не мелі поспеху. Стварылася ўражанне, што пракуратура папросту "шыла" нам гэтую справу. І здаецца, што агульнае кіраўніцтва гэтай "справай" было ўвогуле не з Гародні. Насуперак сцвярджэнню пракуратуры, у матэрыялах справы ляжаць тры, я падкрэсліваю — тры! — незалежныя адна ад адной лінгвістычныя, літаратуразнаўчыя, мовазнаўчыя экспертызы. Аўтарытэтныя ў сваёй галіне людзі аднazначна сцвердзілі — паклёпу няма!

Разам з тым пракуратура гродзенскай вобласці, якая сама ж і замаўляла гэтыя экспертызы, сцвярджае, што паклёп ёсць.

Калі інкрымінуецца паклёп, то галоўны пункт абвінавачвання — распаўсюджванне звестак. Гэтага таксама не было. Як вядома, гэтыя "крамольныя" артыкулы былі канфіскаваныя пракуратурай яшчэ ў друкарні — дарэчы, насуперак закону.

Пракуратура абапіраецца на раздрукоўкі нейкіх матэрыялаў сайту, якія прадставіў УКДБ па Гарадзенскай вобласці. Але калі мы ўважліва паглядзелі на раздрукоўкі, то ўбачылі, што кампутар, з якога адбывалася раздрукоўка, нават ня быў падключаны да інтэрнэту...

— І чым вам усё гэта пагражае?

— Згодна тым санкцыям, якія прадугледжаны крымінальным артыкулам — абмежаванне волі або турма тэрмінам да пяці гадоў.

Але я, калі казаць шчыра, (гэта не значыць, што я вельмі вялікі альтруіст), больш думаю пра тое, чым гэта ўсё пагражае беларускаму грамадству і беларускай журналістыцы. Як чалавек, які ў свой час вывучаў гісторыю, я бачу вельмі вялікае падабенства з тымі метадамі і з той дзейнасцю, якая была ў Савецкім Саюзе падчас масавых рэпрэсіяў 37-39-40 і пазнейшых гадоў.

Я вельмі не хачу, каб гэтыя часы паўтарыліся. Я вельмі хачу, каб мы, беларусы, як людзі, якія жывуць на гэтай зямлі, зрабілі ўсё, каб гэтае зло, уся гэтая цемра была нейтралізаваная.

— Чым мы, простыя чытачы, журналісты, грамадзяне, можам вам дапамагчы?

— Я ўпэўнены, што людская, чалавечая, хрысціянская мараль, а таксама законы Рэспублікі Беларусь дазваляюць нам пратэставаць супраць гэтага беззаконня. Мы павінны паказаць, што мы не быдла — "куды пугай накіруюць, туды і пойдзем".

Мы павінны паказаць, што мы — людзі, якія валодаюць канстытуцыйным правам на ўласную думку і распаўсюджванне гэтай думкі. Думкі не судзяцца, словы не судзяцца. Крымінальны Кодэкс судзіць і павінен судзіць толькі (і выключна!) дзеянні.

І калі гэтыя "пракуроры" — я настойваю на двукоссі, таму што падобныя — не пракуроры, гэта інквізітары — пабачаць, што ёсць супраціў, што грамадства не хоча жыць па законах, выдуманых імі... Я думаю, што тады у нас не будзе такіх судоў, у нас не будзе падставаў чырванець за сваю краіну і сваіх чыноўнікаў. Тады ў нас на Беларусі будзе лепшае жыццё.

(Працяг на стар. 2)

Папярод цягніка
Агляд заўтрашніх падзей

15 сакавіка — Дзень Канстытуцыі. Пра гарантаваныя Асноўным Законам правы сацыял-дэмакраты плануюць узгадаць у 17.30 на плошчы Якуба Коласа ў Мінску.

15 сакавіка ў Горках адбудзецца чарговае паседжанне грамадскага клубу "УзГорак". Тэма сустрэчы — экалагічныя праблемы рэгіёна. У якасці экспертаў запрошаны прадстаўнікі Асацыяцыі ўстойлівага развіцця, таварыства аховы прыроды і раённага камітэта па экалогіі.

22 сакавіка Беларускае аб'яднанне маладых палітыкаў пры падтрымцы Фонда Ф. Эберта ладзіць круглы стол на тэму: "Лібералізацыя эканомікі Беларусі: праблемы і перспектывы". Мерапрыемства адбудзецца ў ІВВ (пр. газеты "Праўда", 11 А). Пачатак а 18 гадзіне.

5-7 красавіка Маладзёжны сацыяльны цэнтр "Майстэрня будучыні" пры падтрымцы БДФ "Дзецям Чарнобыля" і Міжнароднай Асацыяцыі гуманітарнага супрацоўніцтва ладзіць ІІІ фестываль-конкурс "Моладзь супраць экалагічнага гвалту".

МУЗЫЧНЫ ВАГОН

19 сакавіка ў сталічным музеі М. Багдановіча лейбл БМА group прэзентуе новы праект "Прыгожае". Пачатак у 16.30.

21 сакавіка ў дольнай зале Чырвонага касцёлу (Мінск) адбудзецца канцэрт з удзелам Алеся Камоцкага. Пачатак а 19 гадзіне.

23 сакавіка ў Тэатры эстрады адбудзецца 9 фэст "Сіні перац". Удзельнічаюць: "Князь Мышкін", "Zvuuk", "Нагуаль", праект "Pete Paff", музыкі Сяргей Пукст і Яўген Алейнік ды інш.

ДАБРАЧЫННЫ ВАГОН

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны абвясціла аб зборы ахвяраванняў на выданне беларускіх каляндарыкаў з партрэтамі Янкі Купалы, Якуба Коласа і Ігната Дамейкі, а таксама на падпіску газеты "Наша слова" вясковым і школьным бібліятэкам, якія не маюць на гэта сродкаў. Грошы можна пералічваць на разліковы рахунак № 3015212330014 у МГД ААТ "Белінвестбанк" г. Мінска, код 764 альбо выслаць паштовым пераводам на адрас: ТБМ імя Ф. Скарыны, 220005 Мінск, вул. Румянцава, 13.

ВІРТУАЛЬНЫ ВАГОН

19 сакавіка з 16 да 20 гадзінаў на сайце www.charter97.org адбудзецца on-line канферэнцыя з Юрыем Хашчавацкім. Мовы — расейская, беларуская, англійская.

ПЕРСАНАЛЬНЫ ВАГОН

12 красавіка ў парк-клубе "Мінск" адбудзецца прэзентацыя новага альбому гурта НЕЙРО ДЮБЕЛЬ. Напярэдадні гэтай падзеі "Беларуская маладзёжная" праводзіць прамую тэлефонную лінію з вакалістам каманды Аляксандрам Куліковічам. Задаць свае пытанні ці проста паразмаўляць з прыемным суразмоўцам можна будзе **1 красавіка** з 17.00 да 18.00 па тэл. 220 98 04.

ПРЫЧАПНЫ ВАГОН

Юрый Хашчавацкі, Валерый Шчукін, Дзмітрый Бандарэнка, Мікалай Халезін і Цімох Дранчук падалі ў Мінгарвыканкам заяўку на правядзенне **19 красавіка** ў Мінску акцыі "Марш Пратэсту "ТАК ЖЫЦЬ НЕЛЬГА!". Акцыя мусіць пачацца ўвечары з пл. Я. Коласа і завершыцца на Кастрычніцкай плошчы мітынгам.

Падрыхтавала Насцёна Пятроўская, "БМ"

• Міністр абароны ЗША Доналд Рамсфэлд абвясціў, што баявая аперацыя ў Афганістане блізкая да заканчэння. У той жа час беларуская Асацыяцыя інвалідаў вайны ў Афганістане заяўляе пра магчымасць пашырыць сувязі з сваімі замежнымі калегамі.

"Без друзей меня чуть-чуть, а с друзьями — много!!!"

• Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад'ехаў у Аўстрыю, па некаторых звестках, на лячэнне. У той жа час кіраўнік калгасу "Радзіма" Аляксандр Лапацентаў прапанаваў кожнаму калгасніку, які не паліць, выплочваць 10 % прэмію. А тым, хто не п'е — ажно 15 %.

"Кто не курит и не пьет, тот здоровеньким помрет," — сцвярджае народная мудрасць.

• Грузінскія мадэльеры-авангардысты правядуць у Панкіскай цясніне (магчымы прытулак чачэнскіх тэрарыстаў) паказ мод. А ў Мінскай вобласці кожнай з 16 жанчын-кіраўнікоў гаспадарак аблвыканкам на 8 сакавіка прэзентаваў па трактары.

"Гвозди бы делать из этих людей," — марыў пралетарскі паэт Маякоўскі.

• Былы спікер беларускага парламенту Сямён Шарэцкі атрымаў ад на жыхарства ў ЗША і права на матэрыяльную дапамогу ў памеры 700 даляраў штомесяц. А былы спікер Станіслаў Шушкевіч застаўся пры сваіх двух баксах пенсіі — так вырашыў суд Маскоўскага раёну сталіцы.

"Дзесяць адсоткаў і ні цэнтам меней!" — патрабаваў герой культавага фільму "Случай з пацаном".

• У Амстэрдаме мужчына з вінтоўкай М-16 уварваўся ў памяшканне аднаго з бізнэс-цэнтраў і запатрабаваў спыніць продаж тэлевізараў з шырокім экранам. Як лічыць следства, небарака проста пераблытаў: офіс кампаніі "Філіпс" знаходзіўся насупраць.

Амерыканскія ВВС таксама памыліліся: засекшы штурхную ў прыбіральні на борце авіялайнера, які ішоў на Нью-Ёрк, вайскоўцы паднялі ў паветра знішчальнікі, каб прадухіліць магчымы тэракт. Высветлілася, што прычынай шуму стала парачка гарэзаў-гомасэксуалістаў.

"Слоны идут на фиг, а шпион Иванов живет этажом выше", — барадаты анекдот.

• Французскі суд загадаў пахаваць целы доктара Мартыно і ягонай жонкі, якія па завяшчанні захоўваліся ў лядоўні. Трыюмфу медыцыны будучыні гэтыя нябожчыкі ўжо не дачакаюцца. А ў Мінску чакаецца пахаладанне да мінус трынаццаці.

І гэта ўжо не жарт...

Даже мартовский кот должет думать, что орет. А не то за клевету припаяют и коту!

Цёпла... цёпла...

Апошнія сем гадоў менавіта з Дня Канстытуцыі апазіцыя пачынае вымяраць "гарачую вясну" і грацыяца ў чарговы раз з дапамогай народных масаў "намыліць шыю ўраду". Але чаму лічаць "гарачыя вёсны" толькі ад 1996? Вельмі цікава паглядзець, супраць чаго і як у розныя часы пратэставалі па вясне нашыя суайчыннікі...

Насамрэч, самая гарачая вясна ў беларускай гісторыі адбылася ў **грамавым 1991 годзе**. Тады савецкі ўрад абвясціў аб падвышэнні коштаў на ўсёй тэрыторыі СССР з 2 красавіка. Ужо трэцяга красавіка Мінск страсянуўся — працоўныя пяці заводаў спынілі працу і выйшлі на вуліцу, перакрыўшы рух транспарту.

На наступны дзень мітынгоўшчыкі пачалі працаваць, але "зараза" перакінулася на іншыя прадпрыемствы. Працу спынілі гіганты — МАЗ, МТЗ, якія поўным складам пад кіраўніцтвам стачкама і Рабочага Саюзу рушылі маршам да Дома ўраду, перакрываючы па дарозе рух транспарту.

На плошчы Незалежнасці (тады Леніна) некалькі дзён грымелі мітынгі колькасцю па 50-70 тысячаў чалавек. Працаўнікі патрабавалі не толькі аслаблення эканамічнага ціску, але і адстаўкі ўраду СССР, выбараў Вярхоўнага Савета Беларусі, адмаўлення кіруючай ролі кампартыі.

Страйкавалі не толькі Мінск, але і ўсе прамысловыя цэнтры, уключаючы шахцёрскі Салігорск. У Воршы мітынганты двойчы перакрывалі стратэгічна важную чыгуначную магістраль.

Перапужаная ўлада нават не вельмі спрабавала падаўляць выступы, "паджаўшы хвост"... Але далей справа пайшла па знаёмай сучаснай схеме. "Гарачую вясну-91" схітрыліся "забалбатаць", не выканаўшы прынцыповых патрабаванняў... Калі распачалася нечарговая сесія Вярхоўнага Савета, мітынгаў ужо не было.

У 1992 годзе Беларусь стала незалежнай. Вясна пачалася з траурнага камуністычнага мітынгу на гадавіну рэферэндуму аб лёсе СССР, мітынг праходзіў на плошчы Незалежнасці. Дарэчы, менавіта яна да 1997 года была нязменным цэнтрам палітычнага жыцця.

Але галоўным хітом сезону быў новы страйк салігорскіх шахцёраў, якія пры падтрымцы свабодных прафсаюзаў і БНФ працягвалі ціснуць на ўлады. У Салігорску адбыўся мітынг на 12 000 удзельнікаў — для правінцыі неперакрыты рэкорд, грымелі мітынгі і ў Мінску.

Дарэчы, метады палітычнага змагання тады былі больш смелымі і радыкальнымі, чым зараз. Напрыклад, некалькі шахцёраў, разбіўшы свой намёт проста на плошчы Незалежнасці, абвясцілі галадоўку. А ўдзельнікі аднаго з мінскіх мітынгаў усур'ёз прапаноўвалі ўзяць сталіцу ў транспартную блакаду, перакрыўшы ўсе магістралі, і ўжо з гэтых пазіцыяў весці перамовы з урадам. Адгаварылі іх ад гэтай задумы сябры-дэпутаты з БНФ.

У 1993 годзе асноўныя мітынговыя баталіі грымелі вакол уваходжання Беларусі ў дамову аб калектыўнай бяспецы. Па старой завядзёнцы свабодныя прафсаюзы разам з БНФ правялі і дастаткова гучную акцыю з патрабаваннем адстаўкі наменклатурнага ўраду.

Ды і больш дробныя арганізацыі і простыя грамадзяне пачувалі сябе вельмі вольна. Напрыклад, нечакана было прачытаць у газетных падшыўках, як у Старых Дарогах "зялёныя" актывісты колькасцю пад 50 чалавек штурмавалі і захапілі будынак райвыканкаму падчас абмеркавання праекту будаўніцтва камбінату па перапрацоўцы таксічных адкідаў. Сёння гэта б кваліфікавалі амаль як тэракт...

Самым "халодным" атрымаўся **1994 год**. Тады спроба палітычнага страйку, якім пагражала БНФ разам з прафсаюзамі, нечакана правалілася. Ці то народ стаміўся, ці люты — не лепшы месяц для "гарачай" вясны... Гучных акцыяў больш не было — апрача традыцыйнай акцыі БНФ на 25 сакавіка.

Але ўжо **1995** год пачаў зноў набіраць абароты. Хітом сезону стала праведзеная Партыяй аматараў піва і Свабодным прафсаюзам студэнтаў акцыя **"Дзеці хлусні вяртаюцца"**, калі тры сотні студэнтаў прамаршыравалі вакол прэзідэнцкай рэзідэнцыі і зарвалі БССРаўскі сцяг перад публічнай прыбіральняй. Акцыя скончылася разгонам і масавымі арыштамі, а лідэр ПАП Андрэй Рамашэўскі ("Борман") стаўся першым беларускім палітвязнем...

Далей мы добра памятаем **1996** — нечакана буйныя тры мітынгі запар, Чарнобыльскі Шлях, перакуленыя машыны на праспекце Скарыны. Студэнтаў збіваюць і выганяюць з універсітэтаў, галадоўка Хадыкі і Сіўчыка. Заклікі "Свабоду Адамовічу" ды "Свабоду Рамашэўскаму!", уцёкі Пазьняка...

Вясна **1997** плаўна перацякла з неспакойнай пострэферэндумнай зімы. Тады супраць вынікаў рэферэндумаў 95 і 96 мітынгавалі ўсе, каму не лянота — прафсаюзы, партыі, моладзь. Удзел у акцыях брало менш народу, затое ён быў больш адчайны — кадры сутыкненняў з АМАПам і бойка ля Расейскага Пасольства, залітыя крывёю твары журналістаў не сыходзілі з тэлеэкранаў.



Відаць, перанасычанасць і абумовіла не вельмі паспяховыя вёсны наступных гадоў. Немагчыма ўвесь час жыць на адрэналіне. І "перакушаўшыся" яго ў 1997, народ асцярожна глядзеў за пошукамі новых формаў Маладым Фронтам увесну **1998**. Вулічныя карнавалы, апазіцыйныя алімпіяды, сцягі на дахах дамоў...

Вясну **1999** акупаваў Віктар Ганчар з віртуальнымі выбарамі прэзідэнта. Запомнілася яна не мітынгамі, а масай хадакоў і актыўнай палемікай вакол паўнамоцнасці "ценявога выбаркаму", у якую ўвязалася нават кіраўніцтва краіны.

А далей... Праходзілі традыцыйныя мітынгі па традыцыйных датах. Парушэнне сцэнару адбылося толькі аднойчы — калі ў **2000** годзе ўлады нечакана жорстка разагналі дэманстрацыю 25 сакавіка. Горад нагадваў акупаваны Сектар Газа — спецназ з сабакамі, вадамёты, БТРы камуфляжнага колеру... Кажуць, гэта быў наўмысны расклад, каб пракруціць інтрыгу ў кадрах МУС. Але да пратэсту гэта мела слабое дачыненне.

Перадвыбарчы **2001** адзначыўся першымі "ланцугамі неабыякавых людзей". Але асноўную "гарачыню" прыхавалі для лета...

Не бяруся сказаць, якой будзе поствыбарная вясна 2002. Сёння замест "Свабоду Рамашэўскаму" варта скандаваць "Рукі прэч ад Маркевіча". Сённяшні ізноў нашыя бацькі не маюць чаго нармалёва есці. Але якой будзе вясна-2002 не залежыць ад мяне, ні не вельмі залежыць і ад палітыкаў, што праводзяць чарговыя акцыі па календарным графіку.

На вуліцы цёпла. Шчыра кажучы, упершыню за пяць гадоў хочацца вольна выйсці на праспект, удыхнуць на поўныя грудзі вясновае паветра і ... памятаць, што калі хочаш нешта зрабіць, варта рабіць гэта самому, не чакаючы каманды ні ад кога.

Пайшлі?

А. Панкратаў, для "БМ", фота IREX/ProMedia

Почему люди ходят на митинги?

Кинорежиссер Юрий Хащеватский, правозащитники Валерий Щукин и Дмитрий Бондаренко, журналист Николай Халезин и активист незарегистрированного движения «Зубр» Тимофей Дранчук во вторник подали заявку на проведение в Минске "Марша протеста "Так жить нельзя!". Согласно их заявке, акция должна пройти 19 апреля в 18 часов с площади Якуба Коласа и завершиться митингом на Октябрьской площади.

Марш протеста задуман, как *"привлечение внимания к проблеме невыполнения Александром Лукашенко своих предвыборных обещаний в качестве кандидата в президенты РБ"*. Александр Лукашенко, по мнению организаторов акции, не выполнил основные пункты своей предвыборной программы 1994 и 2001 годов: компенсировать все потерянные вклады населения, резко повысить уровень благосостояния народа и приблизить его к уровню развитых европейских государств, не смог найти пропавших известных общественных деятелей Беларуси. Впрочем, список невыполненных обещаний был и более широк.

Это уже четвертый митинг, запланированный на весну-2002. 15-го марта социал-демократы отмечают День Конституции. 25-го марта запланирован День Воли. Не обойдется без "Чарнобыльскага Шляху". При этом, согласно общепринятому мнению, народ давно разочаровался в уличных акциях и на них не ходит. Тем не менее, акции продолжают заявляться и делаться — все новыми людьми. Собственно, почему? Организаторы акции "Так жить нельзя!" попытались объяснить, что ими движет.

__Тимофей Дранчук:__

— Больш за 70% моладзі прагаласавала на выбарах супраць Лукашэнкі. Менавіта гэтым можна патлумачыць, што працягваюцца рэпрэсіі датычна моладзі і спробы завербаваць маладых людзей. Гэтым можна патлумачыць тое, што больш за 70% моладзі ад 16 да 19 гадоў не хочуць жыць у Беларусі, а хочуць жыць у іншай краіне. Але 70% моладзі — гэта занадта вялікая для Беларусі колькасць народу. Таму я думаю, што прасцей было б з'ехаць з гэтай краіны Лукашэнку.

Мы зрабілі свой выбар 9 верасня, але зараз такая сітуацыя, што мы будзем адстойваць яго на вуліцы.

__Валерий Щукин:__

— Пенсионеров у нас достаточно много, и в большинстве своем они поддержали Лукашенко на выборах. Но очень немногие поддержали его сознательно. Хотя живут они далеко не хорошо. У моей жены пенсия — 67000. Это около 2000 в день. Как можно прожить на такие деньги?

Люди, которые отдают четверть века службе Родине, потом оказываются в странном положении. Да, пенсия у военных больше. Но тут ситуация совершенно иная: каждый гражданский человек, выходя на пенсию, что-то имеет — дачу, квартиру... Военный человек вообще ничего не имеет, и, выходя на пенсию, ему нужно начинать с нуля — при полном отсутствии перспектив.

Как я понял, власть боится одного — уличных акций. И другого пути, кроме как уличные акции, я не вижу. Причем этих акций должно быть как можно больше. Как говорит известная частушка: «Лучше сорок раз по разу, чем один раз сорок раз».

__Юрий Хащеватский:__

— 8 лет президентства Лукашенко названы "небольшим сроком". Но что за это время произошло в Польше? 8 лет назад поляки везли из Беларуси все, что угодно. А теперь народ, который живет в Бресте, возит из Польши продукты — потому что они там дешевле. Наши люди уже не торгуют на вокзалах в Москве продуктами — и меня все спрашивают: "Почему?". Да потому что у нас — российская продукция в магазинах!

Практически сразу после трагедии в Нью-Йорке я был в Америке и смотрел подробную хронику этих событий. В "Близнецах" работало около 50 000 человек. Люди по узким пожарным лестницам выносили инвалидов. И никто никого не затоптал! У нас под гром и дождь толпа затоптала более 50 молодых людей. Этот стиль руководства нас превратил не в народ, а в толпу.

__Николай Халезин:__

— Я не пошел бы на эту акцию протеста. Меня родители заставили. Когда развалилась "великая и могучая страна", у моих родителей на сберкнижке лежало 15 000 рублей, которые Лукашенко обещал вернуть. На эти деньги я мог бы купить 30 телевизоров SONY. Я мог бы обставить холодильниками порядка 100 квартир. Где деньги? Индексация "советских" вкладов — это был ПЕРВЫЙ пункт предвыборной программы Александра Лукашенко в программе 1994 года. Теперь я должен выйти на улицу и спросить у него: где мои деньги и деньги моих родителей?

Между прочим, все заявители «Марша протеста» практически единогласно утверждают, что "все решится в этом или в следующем году". Они ожидают нового референдума, на котором Лукашенко, по из прогнозам, должен инициировать "продолжение полномочий незабаевски", ибо другого выхода у него нет. Единственным способом противостояния "пожизненному президентству", по мнению организаторов акции, является только улица.

Ранее у этих людей получалось проводить массовые акции протеста. Получится ли сейчас?

По крайней мере, в очередной раз заявлено, что на Бангалор никто не пойдет. "Мы высказываем протест этой власти и пойдем к ней — на Октябрьскую площадь", — заверил Дмитрий Бондаренко.

Сергей Пульша, "БМ"

Рукі прэч!

(Пачатак на стар. 1)

__А вось як каментуе сітуацыю журналіст Павел Мажэйка:__

— Напярэдадні выбараў прэзідэнта, у нашым перадвыбарчым нумары я выступіў як звычайны грамадзянін Беларусі — з тэкстам, дзе паказаў, што я хацеў бы, каб маім наступным прэзідэнтам быў нармальны здаровы чалавек, за якога мне не было б сорамна. Пра якога не было б сорамна гаварыць тут, у Беларусі, ці за яе межамі.

І я выказаў рытарычнае пытанне: ці можа быць вартым народнай падтрымкі чалавек, які змагаецца са сваімі апанентамі, забіваючы іх? Не ведаю чаму, але пракуратура вырашыла, што пытанне мае дачыненне да аднаго з кандыдатаў (на той час) у прэзідэнты — Аляксандра Лукашэнкі.

І цяпер у суд перададзеная крымінальная справа, па якой нам пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі.

— Павел, што сказаў калектыў пасля таго, як газету нібыта з-за вас з Маркевічам зачынілі?

— У нас людзі працуюць разумныя. Абсалютна кожны бачыць бессэнсоўнасць такіх закідаў з боку пракуратуры. І вось ужо пяць месяцаў прайшло пасля распачатку гэтай справы, але калектыў усё ж працягвае працаваць разам, спадзеючыся на выданне нейкай новай газеты.

— Зараз вы не шкадуеце аб тым, што напісалі тады?

— Не! Як можна шкадаваць аб нейкай сваёй пазіцыі ці аб нейкіх думках, на якія я, як нармальны звычайны грамадзянін краіны, маю права? Я нікога не забіў, не скраў нічога ні ў малых, ні ў буйных памерах... Толькі выказваў сваю пазіцыю, сваё меркаванне — і за гэта я маю праблемы з сённяшняй беларускай уладай. Але ні аб чым не шкадую.

— Чым мы ўсе можам вам дапамагчы?

— Многія нашыя сталыя чытачы і сябры газеты спрабавалі нейкім чынам выклікаць грамадскі рэзананс — хаця б у Гродна. Але мясцовыя ўлады забараняюць пакуль што нейкія масавыя акцыі пратэсту.

І таму, пэўна, найбольш дзейсным спосабам з'яўляецца падача нейкіх зваротаў пратэсту ці лістоў пратэсту. І галоўнае — не здавацца!

А. Панкратаў, для "БМ"

P.S. ***У сераду ў рассылцы міжнароднай журналісцкай сеткі Indymedia з'явіўся зварот беларускіх журналістаў, у якім яны заклікаюць актывістаў усяго свету пікетаваць беларускія амбасады і закідваць іх, а таксама афіцыйны сайт Аляксандра Лукашэнкі петыцыямі з патрабаваннем спынення пераследу беларускіх рэпарцёраў.***

Але абарона сваіх суайчыннікаў можа быць дзейснай, толькі калі яна мае падтрымку тут.



Дорогой гранит науки

Систему образования в Беларуси реформировали неоднократно. Сначала в школу пошли шестилетки, затем последовала замена десятилетнего образования двенадцатилетним. Но эксперимент с шестилетними учениками до сих пор вызывает у многих родителей, учителей и детских психологов негативное отношение, и они стараются продлить своим чадам детство на год. Двенадцатилетнее образование вызывает усмешки: мол, ученицы на выпускной с колясками приходить будут, а юношей-выпускников поджидать автобус из военкомата. Теперь на подходе очередная реформа — частичный переход на платное предоставление дополнительных услуг в сфере образования. Говорят, что толчком для этого послужила оброненная президентом фраза: "Каждую школу я могу обеспечить одним компьютерным классом. Остальное — пусть зарабатывают сами".

Одна из самых бюджетных сфер должна встать на хозяйственные рельсы и зарабатывать деньги, что, по мнению заместителя министра образования Александра Жука, *"позволит повысить качество и уровень образования"* (БДГ № 33, 5.03.02). Перечень "статей доходов" включает в себя и организацию платных кружков, и изучение второго иностранного языка, и эксплуатацию школьного компьютерного ресурса, а также сдачу в аренду школьных столовых для банкетов и увеселительных торжеств. Каким образом это отразится на качестве и уровне образования — остается загадкой. Тем не менее, директоры школ, по заверению замминистра А. Жука, двумя руками ратуют за предоставление возможности получить "лишнюю" копейку. Вот только получат ли? Вернее, кто получит, на ком и для кого заработают школы?

Распоряжаться заработанными средствами самостоятельно школы не смогут. Все средства должны будут перечисляться в местные бюджеты. А уж как ими распорядится администрация, только ей и известно. Сфер применения школьным деньгам в нашем экономически неустойчивом государстве предостаточно: то посевную-уборочную накрыть, то здание какого-либо учреждения отремонтировать. Даже если деньги все-таки будут возвращаться к "добытчикам", каким образом они будут распределяться среди школ района? Пропорционально заработанному или опять по принципу уравниловки? Логичней было бы, чтобы все вырученные деньги поступали на расчетные счета школ и после взимания всех необходимых налогов учебное заведение распоряжалось бы прибылью по своему усмотрению. Но подобного не предвидится. Минобразования бросило клич, но где же решение Министерства финансов и инструкции об упорядочении финансовой деятельности в школах? Как будет выглядеть процедура уплаты за дополнительную дисциплину? Школы будут "обслуживать" желающих (если таковые, конечно, найдутся) за наличный или безналичный расчет? Неужели ученик, желающий провести часок за компьютером, должен будет принести квитанцию об оплате или в штатном расписании появится должность кассира, со всеми причитающимися атрибутами, дающими право принимать наличные деньги?



"Рублевое реформирование" образования на фоне перманентного повышения цен на продукты питания и жилищно-коммунальные услуги обречено на долгое и мучительное дерганье, при котором затраты вряд ли будут окупаться доходами. Навряд ли родители школьников благосклонно отнесутся к этому новшеству. И это — если оценивать ситуацию в городах, а особенно в столице, где уровень доходов значительно выше, нежели на селе. Как сельские школы смогут зарабатывать, если учителей на основные предметы школьной программы не хватает, а всех учеников, посещающих школу, не наберется на среднегородской класс?

Пока очередная "реформа" школы вызывает лишь недоумение и многочисленные вопросы. А не проработанный закон, тем более касающийся финансов, рискует породить массу нарушений и недопонимания или превратиться в еще одно чудо законотворчества.

Конечно, мы не сомневаемся, что, затевая всяческие нововведения, Министерство образования руководствуется благими намерениями. Но, как известно, благими намерениями вымощена дорога в ад. И этим путем придется идти не министрам и не законодателям, а учителям и родителям учеников. И вот что они думают.

Поборы унижают и родителей, и учителей,

— считает Е. В. Рыжко, преподаватель младших классов 51 минской школы

— Я негативно отношусь к этой затее. Уровень жизни большинства наших людей еще не достиг той степени благополучия, когда можно будет платить еще и за школу, и за детские сады. Школа должна быть государственной, то есть бесплатной. Только тогда она будет честной, знания будут даваться и оцениваться честно.

Даже при существующем сейчас бесплатном образовании, около 5 % детей не посещают школы. Это дети из малообеспеченных и социально неблагополучных семей. А если еще начнут требовать оплату за обучение, то процент этот, я уверена, вырастет. У большинства родителей на путевку в летний оздоровительный лагерь денег нет, куда уж еще и за обучение деньги драть?

Мой старший сын сейчас учится в университете, бесплатно. Но если бы он не поступил, то учить его на платном отделении я бы не смогла. И это несмотря на то, что зарплата сейчас у учителей, по сравнению с другими бюджетниками, довольно приличная. Я, как учитель младших классов, получаю 200 тысяч, а в старших классах зарплата учителя чуть выше.

Боюсь, чтобы не получилось так, что умные, но бедные дети останутся "за бортом". Какое же тогда будущее ожидает нашу страну?

К тому же у нас хватает частных платных школ и гимназий. И если родители — люди состоятельные, они предпочитают отдавать своих детей туда. Хотя, исходя из моего опыта, уровень подготовки в частных школах значительно ниже. К нам приходили дети, родители которых в силу различных причин не могли дальше обучать своего ребенка в платной школе. Дети — безграмотные, и чтобы дотянуть их до общего уровня класса, приходилось заниматься с ними практически с нуля.

— Не получится ли так, что оценивать знания учеников начнут исходя из размера материального взноса их родителей в бюджет школы?

— Не думаю, что это возможно. Наши дети не глупы, и они отлично видят, кому оценки ставят заслуженно, а кому нет. Особенно с введением 10-бальной системы оценок. Перед детьми врать невозможно. Я зачастую не успеваю рот открыть, чтобы сказать оценку отвечающему, а весь класс уже кричит "восемь, девять или четыре". Они уже самостоятельно умеют оценивать свои знания, а обманывать своих учеников — значит самому подрывать свой авторитет в глазах тех, кто тебе безгранично доверяет.

— Согласно реформе, деньги, собранные с родителей, будут перечисляться сначала в местные бюджеты, а уж потом распределяться школам. Не получится ли так, что они вообще уплывут в неизвестном направлении?

— Я такой вариант не исключаю. Пример тому — Россия. Сейчас в Краснодарском крае бастуют учителя из-за того, что деньги-то в местном бюджете есть, но до школ они не доходят. Администрация края пустила средства на какие-то другие цели. Когда возникает необходимость заткнуть какую-то финансовую дыру, деньги в первую очередь берут из бюджета.

— И все-таки, как и на чем современная школа может зарабатывать?

— Мне кажется, школы уж если и должны зарабатывать, то не за счет родителей. Можно оказывать платные услуги населению района, в котором школа находится. Например, сдать пустующие подвальные помещения под офис, или пускать в простаивающие в выходные дни спортзал или бассейн желающих позаниматься спортом. А можно сдавать школьную столовую для проведения банкетов или торжеств. Почему нет? Главное, чтобы все это делалось не в ущерб детям, обучающимся в этой школе, и зарабатывание не превратилось в самоцель. И деньги за эти услуги должны поступать конкретно на счет этой школы. Возможно, тогда в школьных столовых появится приличная посуда, в школьных коридорах будут висеть картины и красивые люстры в кабинетах.

А то, что поборы с родителей в наших школах практикуются давно, ни для кого не секрет. Скажу больше — материальная база школы, в основном, и создается за счет родителей. Из-за этого наши учителя поставлены в довольно неприятное положение. С одной стороны, любой преподаватель хочет, чтобы его ученики приходили в отремонтированный, хорошо оборудованный класс. Но у школы денег сейчас нет — даже для того, чтобы заменить разваливающиеся и облезлые парты. Вот и приходится клянчить деньги у родителей. Нам сейчас в классе надо будет красить полы, и как мне просить родителей сдать необходимую сумму, если, и я это прекрасно знаю, некоторые из них не могут позволить себе купить ребенку дополнительную пару колготок?

В конце концов, все мы платим подоходный налог, часть которого идет и на образование, и на медицину. Так почему бы не закрепить законодательно, что такая-то часть его должна перечисляться конкретно на нужды образования, в школы? Тогда отпадет необходимость в этих поборах, которые унижают и родителей, и учителей.

• Право на слово

"Если поборы легализуют, жди обдираловки"

Вот мнение тех, кого реформа эта коснется непосредственно, мам тех детей, которые уже учатся, или которым этой осенью предстоит пойти "первый раз в нулевой класс". Мы выбрали женщин разных социальных слоев: как "среднестатистических" белорусок, так и жен "новых белорусских". Однако в мнениях своих они оказались практически единодушными.

Анастасия, мать-одиночка, воспитывает 6-летнего Владика.

— Все это мне не очень понятно. У нас по Конституции образование бесплатное. Хотя, мы уже привыкли, что подзаконные акты и декреты не очень дружат с Конституцией. Меня смущает также, каким образом школа сможет зарабатывать деньги. То ли брать деньги с родителей, но это не зарабатывание, а поборы. То ли учителей в свободное от работы время отправлять на паперть или на панель. То ли детишек заставлять улицы мести. Я негативно к этой идее отношусь. Принятие такого закона абсурдно и аморально. Думаю, что многие мамы со мной согласятся.

— А если Вам навязчиво начнут предлагать позаниматься дополнительно с Вашим сыном иностранным языком...

— Мой семейный бюджет не позволяет такие траты. А те, у кого средства есть, и без помощи школы в состоянии нанять своему ребенку репетитора или преподавателя иностранного языка. И, возможно, все это обойдется гораздо дешевле, чем услуги школы. Есть масса студентов-старшекурсников, желающих подработать репетиторством.



Главное, чтобы отказ от услуг школы не повлиял негативно на отношение к ребенку со стороны учителя. Но с этим, я думаю, родительский комитет будет бороться.

Инна, жена предпринимателя со всеми атрибутами "крутой" жизни, как то сотовый и машина, мама 10-летнего Валентина.

— Конечно, из кармана родителей начнут деньги качать. А как они еще могут заработать? У нас в гимназии в последнее время проводится какая-то странная математическая олимпиада. За участие в ней каждый ученик должен заплатить 2000 рублей. Правда, победителю обещают денежную премию. Наверное, из тех средств, что предварительно сдерут с участников. Все эти поборы мне очень не нравятся.

— Как Вы думаете, многие родители смогут позволить себе платить школам?

— Судя по нашему классу, процентов 15, не больше. Для остальных это роскошь.

Татьяна, работник библиотеки, мама 11-летнего Романа.

— Какие платные услуги? Ну, дожили... Конечно, отношусь отрицательно. Что же это получится — те дети, родители которых себе смогут позволить платить, дополнительно будут заниматься на том же компьютере. А что делать остальным? У меня сын, и я прекрасно знаю, что современные мальчишки просто помешаны на компьютерах. Представляете, какой раздрай пойдет?

Я допускаю существование платных кружков по вязанию, рисованию, иностранному языку. Но что касается повышения образования в рамках школьной программы, то тут все дети должны находиться в равных условиях, а не зависеть от толщины кошелька родителей. У нас достаточно платных компьютерных клубов и интернет-кафе, которые может посещать любой желающий. Ну, а в школе если заниматься — то уж со всеми. Я так считаю.

В нашем классе платить дополнительно из 23 человек смогут не больше семи.

— В вашем лицее на школьные нужды с родителей принято собирать деньги?

— Да, как и везде, каждый год на что-то сдаем. А уж если эти поборы легализуют, то, боюсь, все превратится в обдираловку. А что делать детям, у которых родители работают в медицине, культуре, других госучреждениях с небольшой зарплатой? Естественно, такие дети будут чувствовать себя ущемленными. Государственная школа должна создавать равные условия для всех учеников.

Материалы полосы подготовили Г. Уласик, И. Славникова, "БМ", фото IREX/ProMedia

ТВ-программа на неделю

Понедельник, 18 марта

БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.40 Новости.
6.10, 7.10, 8.10 Доброе утро, Беларусь!
9.15, 17.00 «Сыщики». Сериал (Россия).
10.05 Арсенал. Программа об армии.
10.35 Телебарометр. Прогноз погоды.
11.00, 21.50 «Семейные узы». Сериал (Бразилия).
12.20 Час профессионала.
12.45 Волшебная шкатулка «Союзмультфильма». «Волшебное кольцо», «Голубой щенок».
13.20 Худ.фильм «Подросток» («Мосфильм»). 1-я серия.
14.40 Док. сериал «Сокровища мировой культуры» (Германия).
15.20 Детективный сериал «Жюли Леско» (Франция).
18.20 Зона Икс.
18.30 Приключенческий фильм «Робинзон Крузо» (США).
20.00 Главный вопрос.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
22.40 Стадион.
23.10 Планета «АРТ».
0.00 Ночной сеанс. «ДМБ-3». Худ. фильм (Россия).

ОРТ

16.00 Большая стирка.
17.00 Вечерние новости.
17.30 Фигурное катание. Чемпионат мира. Спортивные пары. Короткая программа. Передача из Японии.
18.00 Жди меня.
19.00 «Народ против». Телеигра.
20.00 Время.
20.35 «Убойная сила-2. Способный ученик».
21.40 Независимое расследование.
22.30 Ночное «Время».
23.00 «На футболе» с Виктором Гусевым.
23.30 Ночная смена.

«РОССИЯ»

8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Вести.
8.10 «Селеста, всегда Селеста». Телесериал (Аргентина).
8.45 Семейные новости.
8.50, 16.40 Экспертиза РТР.
9.00 Телесериал «Остров фантазий» (США).
9.50, 22.30 Дежурная часть.
10.20 «Санта-Барбара». Телесериал (США).
16.20 Дорожный патруль.
16.30 Афиша.
16.50 Телесериал «В зеркале Венеры».
17.50 «Комиссар Рекс». Телесериал (Австрия—Германия).
18.50 Спокойной ночи, малыши!
19.35, 22.20 Местное время. Вести — Москва.
19.55 Телесериал «Трое против всех».
20.55 Детектив «Пуаро Агаты Кристи. Двойной грех» (Великобритания).
22.00 Вести — Подробности.
22.45 Комедия «Ночной визит».
0.10 Остросюжетный фильм «Снова в деле» (США).

«КУЛЬТУРА»

9.10 «Романтика романса». Ведущий Л.Серебренников.
9.40 «Иван Селиванов», «Ефимовы люди». Документальные фильмы.
10.50 «Сферы» с Иннокентием Ивановым.
11.30, 15.00, 17.30, 23.00 Новости культуры.
11.45 Вместе с Фафалей.
12.10 «Антология одного стихотворения». Андрей Бартенев.
12.15 «Тесные врата». «Младший сын».
12.30 «Осенние портреты». Юнна Мориц.
13.00 «Культурная революция». «Героя нашего времени не существует». Программа М.Швыдкого.
13.50 «Похититель печенья», «Бешеные деньги за будду». Короткометражные худ. фильмы (США).
15.10 Кино — детям. «Грозовые камни». Телесериал (Австралия).
15.35 «По собственному желанию», «Про Петрушку». Мультфильмы.
16.00 Alma Mater.
16.30 «Иван Селиванов», «Ефимовы люди». Док. фильмы.
17.50 «Век Русского музея». Авторская программа В.Гусева.
18.15 «Страсти по-итальянски». Телесериал (Италия).
19.10 Вечерняя сказка.
19.30 Театральная Россия. А.Н.Островский. «Не от мира сего». Спектакль театра на Малой Бронной.
21.35 «Что делать?» Программа В.Третьякова.
22.30 От киноавангарда к видеоарту.
22.58 Азбука. Говорите по-русски.

НТВ

7.00, 7.30, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сегодня.
7.10, 7.35 Утро на НТВ.
7.50 Сериал. Боевик «Агент национальной безопасности-III». «Падишах».
9.25 Намедни.
10.35 Куклы.
11.20 Комедия «Моя морячка».
13.20 Ток-шоу «Принцип «Домино».
14.40, 17.35 Криминал.
15.30 Сериал «Досье детектива Дубровского».
16.45 Алчность.
18.30 Герой дня.
18.50 Сериал «Гражданин начальник».
19.55 Сериал «Дальнобойщики».
21.55 Сериал «Скорая помощь-II» (США).
23.25 Гордон.

СТВ

6.00, 16.30 «Пауэр рейнджерс, или Могучие рейнджеры». Телесериал.
6.30, 16.05 «Мир Бобби». Мультипликационный сериал.
7.00 Информационная программа «168 часов Минска».
8.00, 22.50 «Виртуальный мир».
8.15 Фантастический боевик «Плачущий убийца».
10.30, 0.45 «М 1». Музыкальная программа.
11.00 «Канал истории»: «Билл Гейтс». Док. фильм.
12.00, 15.00, 19.00, 23.00 «24 часа».
12.15 «Добро пожаловаться».
12.20, 23.15 «Арт-экспресс». Культурная жизнь столицы.
12.45 «Марш Турецкого-2». Телесериал.
13.45, 21.40 «Остановка по требованию — 2». Телесериал.
15.15 «Питер Пен». Мультипликационный сериал.
15.40 «Железный человек». Мультипликационный сериал.
16.55 «Чертенок». Теленовелла.
18.00 Спортивные новости.
18.15 «Пока горит свеча...».
18.45 «Премьер-парад «Столичный». Юмористическая программа.
18.50 «Тема дня».
19.15 Детский экран. «Добрый вечер, малыш...».
19.30 Фильм ужасов Гэри Джонса «Пауки».
23.35 Футбольный курьер.
0.15 Ночной музыкальный канал.
0.30 Новости СНГ.

ТВ ЦЕНТР

5.00 Информационно-развлекательный канал «Настроение».
8.00 Смотрите на канале.
8.05 «Однажды у нас вырастут крылья». Телесериал (Мексика).
9.00 «Постскриптум» с Алексеем Пушковым.
10.00, 13.00, 17.00, 21.00 События. Время московское.
10.15 Телемагазин.
10.30 «Петербургские тайны». Телесериал.
11.35 Телеканал «Дата».
12.30 Деловая Москва.
13.15 «Инспектор Кестер». Детективный сериал (Германия).
14.30 Двойной портрет.
14.55 Путь к себе.
15.00 Регионы: прямая речь.
15.30 Дом на Котельниках.
16.05 Древнегреческая мифология и «Русский балет».
17.15 Мода non-stop.
18.00 «Без права на любовь». Телесериал (Мексика).
18.55 Пять минут деловой Москвы.
Впрочем, рассказывают, что инструкторы тоже любят шутить, изображая моментальное умственное помрачнение и с дебиловатой улыбкой неуклюже проверять крепления, озадаченно вздыхая и бурча под нос что-нибудь вроде: "Может, обойдется все как-нибудь". Ну, это все шутки. После того, как почуствуете хлопок инструктора по плечу, как можно сильнее отталкивайтесь от края борта самолета, еще секунда — и вы в свободном полете. Не забудьте дернуть за кольцо (говорят, что натюрморт на земле из нескольких скайдрайверов так и не открывших парашют — роскошное зрелище) и через какое-то время услышите хлопок — это открылся парашют (или лопнул).

Идя на посадку, внимательно осмотрите местность под собой — чтобы не было там всяких пней, ям, кустов и прочих парашютистов. Бывалые любят рассказывать байки про то, как начинающие парашютисты часами висели на деревьях, изображая елочные игрушки, пока вдоволь насмеявшиеся спортсмены и инструктора не снимали бедолаг.

Вот, собственно и все. Как может показаться — все до ужаса просто и банально. Впрочем, лично меня, панически боящуюся высоты, никакими коврижками в самолет не заманишь, а если уж и заманишь (что пару раз в моей жизни случалось), не вытолкнешь из него никакими способами. Как говаривала мультяшная Масяня: "Не-е-ет уж, фигушки!". Мне как-то и тут, на Земле, неплохо и спокойно.

Алька, для "БМ"



Считается, что впервые идея создания парашюта пришла в голову Леонардо Да Винчи. В его рукописи 1495 года можно было найти следующий текст: "Если у человека имеется палатка из накрахмаленного полотна, каждая сторона которой имеет двенадцать локтей в ширину и столько же в высоту, он может броситься с любой высоты, не подвергая себя при этом никакой опасности". Однако описание первого опыта использования парашюта встречается только в 20-х годах XVII века: француз Лавен, отбывая заключение в крепости, соорудил из простыней шатер и прикрепил к его низу веревки и пластины из китового уса. Выпрыгнув из крепости, Лавен весьма удачно приводнился на протекавшую внизу речку. Правда, история умалчивает о дальнейшей судьбе первого скайдрайвера. Однако известно, что дурной пример испытывать летательные средства на заключенных оказался заразительным — в 1777 году еще один француз, Жан Думье, приговоренный к смертной казни, стал испытателем "летающего плаща профессора Фонтажа": в случае успешного испытания смертника обещали оставить в живых. Думье остался жив — прыжок с крыши тюремной башни закончился удачным приземлением. Само же название "парашют" (от греческого "para" — против и французского "chute" — падать) изобрел также француз Ленорман в 1783 году, и выглядело это следующим образом: воздушный шар с прикрепленной к нему корзиной. Особо широкого применения в те времена парашют не нашел — из-за неудобства конструкции.

Пасядзім, пагутарым?

Ужо колькі раз збіраліся на "пасядзелкі" разумныя людзі з грамадскай ініцыятывы "За ўратаванне мемарыялу Курапаты" і ўсё абмяркоўвалі ды абмяркоўвалі... А тым часам маладыя хлапцы і дзяўчаты з другой грамадскай ініцыятывы "Моладзь у абарону Курапатаў" сядзелі ва ўрочышчы і "вартавалі крыжы". Зіму прасядзелі, вясна прыйшла... Упартасць маладых актывістаў шмат каму надакучыла, маўляў: колькі можна? Але шмат хто і прызвычаіўся, што так мае цягнуцца бясконца...

І тут нібыта знянацку Беларускі камітэт міру (БКМ) прапанаваў сваю канцэпцыю мемарыялізацыі Курапатаў ды звярнуўся да ўладаў з пэўнымі дакументамі. "Забіўшая" за сабой права ініцыятывы грамадскасць абурылася.

Канешне, абурацца ёсць чым — у праекце, прапанаваным Камітэтам, напісана, што Курапаты мусяць называцца месцам "пакаяння і прымірэння", і ў якасці сімвалу мемарыялу прапанавалі "падкову". Пры чым тут падкова, што ва ўяўленні людзей заўжды была сімвалам "на шчасце"? А якое шчасце на могілках? Якая "падкова" — пакутнікам?

Што да спрэчнасці "пакаяння і прымірэння"... Сэнс выбітнай гуманістычнай формулы адным падаўся ледзь не рэлігійным дагматам, другім — блюзнерствам. З кім мірыцца? Каму каяцца? Падзеленая даўно (дай Бог, не назаўжды) нашая грамада не даспела да асэнсавання пакаяння дзеля ўзвышэння, прымірэння — дзеля набыцця моцы. І — дзеля еднасці, якой не будзе (на іншых дзяржавах, народах праверана) без жадання асэнсаваць і нават даравць, папрасіць прабачэння за не табою справакаваныя пакуты...

Каб пазбавіцца непатрэбных непаразуменняў, Беларуская асацыяцыя журналістаў арганізавала круглы стол, куды запрасіла самых розных людзей — курапацкіх "абаронцаў", гісторыкаў, архітэктараў, будаўнікоў, і, канешне, прадстаўнікоў БКМ, якія павінны былі распавесці пра свой варыянт мемарыялу. Мусіла адбыцца канструктыўная гутарка.

Але, пэўна, у нашым грамадстве ніколі не ўмелі хутка і якасна вырашаць праблемы. Амаль пасля першага "наезду" наконт "пакаяння і прымірэння", БКМ заявіў, што не прэтэндуе, каб ягоны варыянт праекту лічылі адзіным і канчатковым. Больш таго, Камітэт міру без спрэчак пагадзіўся, што нельга прымаць такія рашэнні без абмеркавання грамадскасці. Галоўная мэта — зрушыць праблему мемарыялізацыі Курапатаў з мёртвай кропкі.

Здаецца — перамога. Чаму б не перайсці да абмеркавання найгалоўнейшых праблемаў — дакладна, па пунктах? Дык не! Што не выступоўца, то — "якое ў Курапатах прымірэнне?". І гэта замест таго, каб вырашаць, як дамагчыся ад дзяржавы прызнання Курапатаў РЭАЛЬНЫМ мемарыялам, з дакладна азначанымі межамі, каб кожны (ці будаўнік, ці звычайны мінак) бачыў і ведаў, што гэта — святое месца, якое мусіць АХОЎВАЦЦА ДЗЯРЖАВАЙ. А што будзе там — ці могілкі, ці вялікі крыж, ці анёл — гэта ўжо другаснае пытанне. Вельмі трапна заўважыў Янка Брыль: "*У гэтай святой справе боязна, што ўсё зацягнецца. Навучыліся б рабіць хутка, але і добра. Бо хто ведае, што цяперашняя сітуацыя — найгоршая? Можа, будзе яшчэ горш...*"

Спрэчкі, дарэчы, крыху сціхлі пасля прапановы Паўла Севярынца, каб БКМ далучыўся да ўжо існуючых грамадскіх ініцыятываў па абароне Курапатаў. Апошнія далі згоду. Прызначылі нават дату сумеснай рабочай сустрэчы. І гэта, канешне, яшчэ адна маленькая перамога. Толькі барані Божа, каб гэтая разумныя галовы ізноў развялі дэмагогію, назначаючы ўсё новыя і новыя "засядалаўкі"...

Людміла Шастак, для "БМ"

Даб'емся выканання!

Традыцыйна пытанне беларускай мовы і яе абароны для кагосьці — балючае, для кагосьці — неіснуючае, а для кагосьці — прынцыповае.

Да першых і апошніх звярнулася Таварыства беларускай мовы. Справа ў тым, што ў мінулым годзе (як сцвярджае ТБМ, менавіта пад іхнім націскам) улады ў асобе Міністэрства адукацыі прынялі чарговы дакумент з серыі "аб мерах па пашырэнні уплыву беларускай мовы..." і г.д.

Цяпер ТБМшчыкі прапануюць усім грамадзянам біць улады іхняй жа зброяй: пісаць на імя старшыняў выканкамаў і загадчыкаў аддзелаў адукацыі лісты — з прапановай адкрыць з наступнага навучальнага года нацыянальную гімназію з беларускай мовай навучання. Бо абяцалі ж! І дакумент пра тое ёсць.

Асобны акцэнт ТБМ робіць на тое, што настаўнікі будучай гімназіі будуць атрымліваць надбаўку ў памеры 20%. Так сказана ў афіцыйных паперах (!).

А між тым у Мінску тэлефонную службу паведамлення часу, як дзесяць год таму, зноў перавялі на расійскую мову...

Ул. інф.

Святкуйма Міжнародны дзень помнікаў і мясцін 18 красавіка!

Каб захаваць сваю спадчыну, трэба памятаць пра яе існаванне. Каб нагадаць пра існаванне таго, што засталося нам "ад прадзедаў спакон вякоў", ініцыятыўная група па стварэнні Беларускага камітэта Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС) выступіла з прапановай шырока адсвяткаваць сёлета Міжнародны дзень помнікаў і мясцін.

Вось ужо дваццаць год большасць краін-удзельніц ЮНЕСКА адзначаюць гэты дзень 18 красавіка. Першага разу святкаваць Міжнародны дзень помнікаў і мясцін было прапанавана ў 1982 годзе з ініцыятывы Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС). Пазней гэты праект быў ухвалены Генеральнай Асамблеяй ЮНЕСКА.

Сёлета ініцыятыўная група па стварэнні Беларускага камітэта Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС) прапануе адзначаць 18 красавіка пад дэвізам "Наша культура неадлучна ад нашай прыроды". Да ініцыятывы далучыўся шэраг грамадскіх аб'яднанняў - МГА "Гісторыка", ГА "ЭКАДОМ", а таксама грамадскія ініцыятывы "Косаўскаму палацу — жыць!" і маладзёвая ініцыятыва "Побач".

Мы плануем правесці талокі па ўпарадкаванню тэрыторыяў гістарычных помнікаў і мясцін — Кальварыйскіх могілак, Лошыцы, Музея валуноў НАН Беларусі ў Мінску, сядзібаў у в. Волма і в. Залессе, палацаў у Шчорсах і Косаве. Таксама ў Мінску будзе зладжаны круглы стол па пытаннях спадчыны з удзелам зацікаўленых бакоў.

Запрашаем далучыцца да святкавання Міжнароднага дня помнікаў і мясцін. Звесткі аб планаваных вашымі арганізацыямі мерапрыемствах просім паведамляць на адрас:

Зав. Калініна, 16, к. 111, к. 52, Мінск, 220012, Беларусь,
Тэл. + 375-17-2661652, 2691001
Факс 2683374
E-mail: info@ecohome.avilink.net

Каардынатару інфармацыйнай рассылкі Жызнеўскай Іне.

Сябры! Няхай гэты дзень будзе не толькі Днём ушанавання нашай нацыянальнай спадчыны, але таксама Днём міжнароднай салідарнасці ў справе зберажэння сусветных культурных і прыродных каштоўнасцяў.

«БДГ. ДСП»: кто еще не читал второй номер?

Второй номер нового ежемесячного издания — приложения к «Белорусской деловой газете» «БДГ. Для служебного пользования» — еще есть в киосках «Белсоюзпечати» и у уличных распространителей, а также в киоске УП «Марат», по адресу: Минск, ул. Интернациональная, 11а.

Почему Белорусская железная дорога не вступилась за своего начальника, отстраненного от должности? Кто из высших чиновников получил квартиры по распоряжению Виктора Рахманько? Читайте материал об итогах проверки работы железной дороги — «Путь единственный, платформа прежняя».

«Рядовой конвейера смерти» — допрос с пристрастием бывшего следователя НКВД, который вел дело прокурора Советской Белоруссии Павла Кузьмина.

Всего три человека знали, как формировался, куда уходил и где хранился белорусский «общак». Собственно, это они этот общак и создали, собрав в одну кассу крупный бизнес «мелкой братвы». В прошлом месяце погиб последний из тех, кто мог написать правдивые мемуары по поводу того, как это было... «Жизнь Петра Наума» — портрет первого белорусского вора в законе.

Где и как брали свой начальный капитал белорусские банки? В каком банке хранятся «деньги партии»? Нужно ли быть богатым, чтобы стать хозяином банка? Специальное исследование наших журналистов.

Посольский двор. Здесь тоже влюбляются, напиваются и страдают... Читайте материал под рубрикой «Тайны дипломатии».

Найдут ли белорусы золото Наполеона? Белорусская тайна московских трофеев французской армии до сих пор не дает покоя исследователям. Кто и где ведет поиск кладов?

Ищите и читайте!

Канчатковы дыягназ?

Незалежная медыцынская камісія "БМ" мусіць з сумам (і з затоенай злараднасцю) канстатаваць, што беларускі мэйнстрым-рок выяўляе пагрозлівыя сімптомы. Куміры падлеткаў — музыкі з гурта N.R.M. — дэманструюць вычварэнскія формы раздваення-растраення-распяцёрання асобы.

Заразу ў калектыў прынёс ягоны нязменны лідэр Лявон Вольскі. Неўтаймаваная прага вядомасці ў рэшце рэшт вылілася ў безліч супольных праектаў, у якіх са шкодай для здароўя так ім ці іншым чынам задзейнічаны ЛАВ. Застарэлыя балячкі кшталту ўдзелу ў разнастайных калядных, гісторыка-патрыятычных ды іншых супольных праектах, здавалася, амаль ужо перасталі непакоіць "хворага на рок-н-ролл". І вось пасля непрацяглай стадыі рэмісіі — новае абвастрэнне. Гэтым разам хвароба абцяжарылася новымі — зусім экзатычнымі і алкагольнымі — праявамі. Сам Лявон лічыць, што гэта яго напаткала "крамбамбулія".


Лявон Вольскі: *"Я дакладна не памятаю, чыя гэта была ідэя... Але ў мяне даўно была думка зрабіць зборнік піўных песень, урэшце гэта рэалізавалася не ў піўны альбом, а ў такі... Больш турыстычны, я б сказаў. Атрымалася падарожжа па розных краінах, і песні больш не разгульнага плану, а хутчэй пра культуру піцця. Няма гэткага разгульева рускага, хаця ёсць песня і ў расійскай стылістыцы. Дакладней, цыганска-расійскай...*

Альбом складзены на аснове і досведу, і вывучэння ўсяго іншага. Напрыклад, сыртакі — тыпова грэцкая песня. Сяргей Кановіч вельмі шмат матар'ялу прагледзіў, каб атрымалася тое, што трэба.

Канешне, і знаўцы грузінскай песні скажуць, што той хор, які ў нас гучыць, не па канонах прауе. Але гэта папросту нашая — стылізацыя, нашае адчуванне, як мусяць гучаць (быццам бы) тыя песні. Гэта ўсё прыдумана.

Дарэчы, "Крамбамбуля" — гэта не толькі фолк. Напрыклад, кампазіцыя "Абсэнт" — у стылістыцы кшталту французскага шансона, штосьці пра каханне, пра кавярні... Нямецкая — гэта Кнейре, піва, песня пра маленькага жаўнерыка, пра вайну — як у немцаў часта гэта бывае."

Удзел у гэтым праекце дастаткова моцна жахнуў па кішэні пацыента — адзін майстэрынг запісанай у польскай студыі "Крамбамбулі" каштуе каля 800 даляраў. Нягледзячы на недахоп грошай, Вольскі ўсё ж спадзяецца выдаць альбом да першага красавіка.



Піт Паўлаў: "Калі за мною прыйдуць санітары, маю гітару ім не аддавай!"

Спецыялісты па некаторых захворваннях сцвярджаюць, што іншым разам поспех лячэння залежыць ад таго, наколькі пацыент асэнсуе сваю хваробу. Маркуючы па гэтым, ЛАВ ўстойліва стаіць на шляху выздараўлення.

Лявон Вольскі: *"Зараз трэба зьмяншаць колькасць праектаў. Я на "Каранацыі" паглядзеў — гэта прымае папросту пагрозлівыя памеры. , урэшце рэшт, можа прывесці да развалу асобы. (sic!)*

Таму што, як ні праект, дык я выходжу: то нешта на гітары граю, то на клавішах, то яшчэ штосьці... Мне гэта перастала падабацца.

Вы ведаеце, я чалавек мяккі, згаджаюся на ўсе прапановы, але іхная колькасць пагражае мяне проста задушыць. цяпер я буду вельмі жорстка выбіраць праекты для ўдзелу."

Будзем спадзявацца, што ў будучым Вольскі будзе больш абачлівым. Але, на жаль, захады па спыненні інфекцыі не былі своечасова зробленыя.

Жахлівая хвароба пачала паступова захопліваць няўстойлівыя непрышчэпленыя арганізмы іншых чальцоў каманды N.R.M. Другой ахвярай "хваробы ЛАВ" (так яе назавуць медыкі будучыні) паў нязменны гітарыст гурта Піт Паўлаў. Зласлівцы, канешне, даўно сцвярджалі, што ён і так збіраецца пакінуць сваю пасаду міністра (Божухна, ці памятае хто яшчэ з падлеткаў-фанаў, што гэтыя пасады існуюць?). Але што хвароба праявіцца настолькі запушчанай, не чакаў ніхто.

З ранку ў мінулы аўторак першы музычны канал праінфармаваў насельніцтва: Піт Паўлаў быццам бы заявіў, што сыход беларускіх рокераў "шмат хто крычыць ці проста гаворыць, але спяваць у стане не многія". І сабраўся выправіць становішча за кошт сябе любімага.

Сумную навіну падцвердзіў і інтэрнэт. Тут людзі, у музычнай медыцыне дасведчаныя, перакаваліся: Піт таксама хворы. Апрэч неадэкватнай ацэнкі сітуацыі ён пачаў загаворваць, больш таго, размаўляць на неіснуючых мовах і крэаціць у неіснуючых стылях, кшталту "хіпнору". Але самым выразным і да болю знаёмым сімптомам з'явілася абвастрэнне захапленнем уласнымі праектамі. Першай ластаўкай стаўся ўдзел акрамя N.R.M. яшчэ і ў гурце "Крыві" і бандзе Аляксея Шадзько. Тады прыступ атрымалася нейтралізаваць. І вось — па новай...

Першы новы праект Піта Паўлава — цяжкі рокавы, завецца "Haгackija". Па словах аўтара, гэта няправільны пераклад слова "Гарадскія" (загаворваецца!!!). Другі праект — этна, мае працоўную назву Pete Paff (амаль Пафф Дэдзі). Сам Піт Паўлаў сцвярджае, што і першае, і другое — лагічны працяг таго, чым ён займаецца ў N:R.M. і "Крыві".

Да таго ж Піт не спыніўся і прыцягнуў да ўдзелу ў "Гарадскіх" яшчэ і бубнача N.R.M. Алезіса Дземідовіча. Хвароба прыняла паўзучую форму...

Пакуль не захварэлым застаецца толькі басіст каманды Юрась Ляўкоў. Але наўрад ці гэта надоўга.

Але самае страшнае для беларускай мэйнстрым-сцэны толькі наперадзе. Уявіце, што станецца з тымі, з кім уступілі ў выпадковую ці не зусім музычную сувязь удзельнікі N.R.M.?

Лявон Вольскі: *"У "Крамбамбулі" са мной супрацоўнічае Кананові́ч — HASTA LA FILLSTA і ўвогуле даволі ўплывовая асоба, перайграў у шмат якіх праектах на сесіі... Уладзіслаў Плюўча, бас — таксама HLF. На бубнах грае халодны прафесіянал Аляксандар Быкаў — "Уліс". Нам дапамагаюць скрыпач з кансерваторыі Аляксандар Хаўкін і яшчэ некалькі палескіх музыкаў..."*

Памножце на колькасць праектаў і зрабіце папраўку на тое, што ва ўсіх удзельнічаюць розныя людзі, якія маюць дачыненне да беларускай рок-сцэны.

Вольскі, Паўлаў, Дземідовіч... Хто наступны?

Брыгада санітараў, "БМ"

***P.S.** Усё вышэйнапісанае просім расцэньваць як першакрасавіцкі жарт і гільятынаўскую публікацыю. Усе выкарыстаныя не па прызначэнні інтэрв'ю — выпадковыя, героі сапраўдныя.*

WASTED: Mystery of Suicide

Metal records, 2002

Тема смерти, суицида, оформленная в виде поисков смысла жизни и обретения веры, похоже, никогда не утратит своей актуальности. Поскольку все время подрастает новое поколение ищущих и алчущих истины, которым во всем нужно убедиться самим.

Минская симфо-дэз команда "Wasted" свои искания умудрилась запечатать в настолько красивую и удобоваримую музыкально-текстовую оболочку, что они стали интересны уже и всем остальным. А назвали все это "Mystery of Suicide".

Типа "интро" — плавное, раздумчивое, мелодичное резко сменяется брутальным гроулингом в "Silence of Thoughts". "Sand", начинающаяся вариациями на тему рыцарских баллад, вдруг безудержно рвется на волю из глубины души яростным утробным ревом. Особенно зацепившая меня лично заглавная песня "Mystery of Suicide" — торжественная, величественная, "звездное небо над нами, моральный закон внутри нас". Да загвоздка как раз в том, что закон этот надо еще отыскать. Но загробный голос на заднем плане — как из подсознания — вдруг начинает коварно нашептывать хрипло, сбивая с мысли, пугая своей откровенной не от мира сегошностью.

Вторая сторона и "When the Skies Call" начинается с — правильно — колокольного звона (достаточно иллюстративно, но недостаточно свежо). Предвкушение полнейшей пустоты приятно щекочет нервы: как в готическом храме, где масса пространства, заполненного высшим и непознанным. Но откровения, видно, не снизошло. А потому "Last Agony" — с последней просьбой, видимо, к Всевышнему, избавить от последующих реинкарнаций, потому как сил на них уже не осталось.

Внушает. Что мне всегда нравилось у Кинг Даймонда и чем цепанул "Wasted" — цельность и концептуальность. Тут у нас история мятущейся души, которая в своих поисках истины, зашла слишком далеко. Нам же постфактум предлагаются запечатленные картинки-образы, с донельзя завороченными текстами (местами, правда, как было сказано выше, темы уже пользованы другими. Кровь на снегу в заснеженном лесу, духи войны и т.д. Но — это неизбежные мелочи. Может, люди так на самом деле видят).

Вообще весь альбом построен на постоянных и неожиданных сменах — темпа, ритма, декораций. Вот, вроде такой жесткий драйв валит и вдруг — оп-па! — приджазованная россыпь клавиш. Впрочем, и это не надоело. И все это как-то здорово и совершенно ненапряжно скомпоновано в одно целое. Подходит для самого разнообразного применения: под отдельные места можно дома на диване расслабляться с банкой пива, а можно и по трассе гнать на бешеных скоростях.

Вот, собственно, и все. Извиняйте, что обложки нет. Если бы мы отсканировали это темно-зеленое нечто (при просмотре на свет наблюдается лого группы, но это если очень внимательно присматриваться), нас бы в типографии технологи не пропустили, а вы бы все равно не разглядели.

И еще — личное пожелание. На нашем металлическом безрыбье (извиняюсь, конечно, еще раз, но хорошие группы такого плана у нас на пальцах пересчитать можно), им бы поиграть побольше, показать себя людям. Говорят, на каком-то из "Затерянных Миров" "Wasted" выступал. Но это было так давно, что уже все успели позабыть. А из ребят, действительно, может выйти что-то очень толковое.

Naska, "БМ"

РОК-ГІЛЬЯТЫНА

АнкеТа для ўсенАроднаГа галАсаВаньня

1. Татальны адстой (Горшы гурт году)
2. Самы правальны альбом
3. Самая адстойная песьня
4. Самы адмарожаны тэкст
5. Самы паганы кліп
6. Закрыццё году

Прапануй сваю намінацыю

Анкеты дасылайце на e-mail: sanitar@tut.by ці на адрас рэдакцыі "БМ". Кожны голас будзе ўлічаны!

• **Рок-гільятына**

Плягіят? Каверы!

Шакуючая навіна сэзону — беларускія рокеры ўсім кагалам ірванулі запісваць каверы DEPECHE MODE. Не прайшло й дзьвацці год з тых часоў, як малады Лявон Вольскі тырчэў пад AC/DC і быў гатовы шчыміць "валнітаў" па кутках мастацкага ПТВ, а адвечнае пытаньне "ты по волне или по металу?" забытае і пахаванае ва ўгары супольных праэктаў.

У трыбьюце DM прымаюць удзел КРЫВІ, Памідораў, Ляпіс...

Уявіце сабе Ляпіс (!), які на беларускай мове (!!) выконвае песьню Дэпешаў (!!!) Шызафрэнія? Не, мода! Усё тлумачыцца вельмі проста — рокерам ізноў трэба грошы. А зарабіць іх прасьцей за ўсё на каверах.

Узгадайце, як разьлятаўся па руках колькі год таму праэкт «Песьнярок», якім шалёным посьпехам карысталіся дзюбелеўскія каверы савецкіх песьняў альбо перасьпяваны "Палянэз Агінскага"... А самай папулярнай камандай на Беларусі дагэтуль зьяўляецца N.R.M., у якой што ні песьня — то NIRVANA ці OFFSPRING.

Тлумачэньне гэтаму ёсьць. Сучасная моладзь існуе ў кантэксьце постмадэрнісцкай культуры, неад'емная частка якой — цытаваньне, цытаваньне і яшчэ раз цытаваньне (з вычварэнскімі перадзелкамі). Унікальныя аўтарскія тэксты не канаюць і нікога не цікавяць. Старое ж пакаленьне, якое жыве ўспамінамі, як крута было адарваць аўтэнтычны дыск "Дып пёпл", ніяк не можа прасекчы — што за понт маладым слухаць перасьпяваныя "Дэпешаў", замест таго, каб захапляцца спрадвечнай спадчынай бацькоў?

Вельмі яскрава гэты канфлікт пакаленьняў праявіўся нядаўна ў яшчэ адной нечаканай плоскасьці — на незалежнай пасядзелцы па прыняцьці незалежнага гімну незалежнай Беларусі. Галоўны раскол пры галасаваньні выйшаў паміж старымі (што падаўляючай большасьцю прагаласавалі за алдовейшы госпэл "Магутны Божа"), і маладняком, якому больш да сэрца прыйшліся кавэры французскіх рэвалюцыйных маршаў. Мала на ўвазе вэрсыю "Інтэрнацыяналу" пад назвай "Мы выйдзем шчыльнымі радамі" і безумоўны гіт апазыцыйнай моладзі — "Пагоню", які можна файна сьпяваць на матыў гімну французскай футбольнай зборнай ("Марсэльеза"). Але гэтыя варыянты пракацілі — не глядзіць старэйшае пакаленьне футбол...

Цяпер пэсымісты з СМІ зьдзекуюцца — маўляў, моладзі ўсё па барабану і ніякай павагі да нацыянальнага гімну яна не дэманструе. А выйсьце, насамрэч, вельмі простае — варта папросту запісаць для маладняку адмысловую мадэрнова-кіслотную альбо рок-балядную вэрсыю "МБ". Тады колькасьць прыхільнікаў нацыянальнага гімну аднязначна імгненна павялічыцца. Дарэчы, гэтым і маглі б заняцца беларускія рокеры — што ўжо тут па "Дэпеш модах" разменьвацца...

Sanitar

Захаваны правапіс арыгіналу

• Школа выживания

История одной семьи

Помните, какой романтичной, какой заманчивой представлялась жизнь в общежитиях в старых советских фильмах? Молодые веселые люди, всегда готовые придти на помощь друг другу. И у которых все впереди. В том числе и собственная квартира — хоть в отдаленном микрорайоне. Наверное, этой самой перспективой и скрашивалась основательно приглаженная кино невыносимая легкость общежитского бытия...

А я хочу познакомить вас с обитателями общежития современного. Многое ли изменилось с советских времен — судите сами.

Итак, «Ощежитие № 4 медработника» выбито на табличке, висящей у входа в здание...

Двери кабины лифта открываются... Вот и «моя» дверь... Стучу... Открывает невысокая женщина и как-то слишком резко спрашивает:

— Вам кого?

— Таню. Мы с ней договорились.

Появляется другая женщина:

— Проходите, не стесняйтесь.

Я делаю шаг и оказываюсь в совсем крошечной прихожей, большую часть которой занимает холодильник и гора курток, висящих на вешалке рядом. Еще два шага — и я в комнате. Ее трудно назвать маленькой, но мебель словно «съедает» все свободное пространство.



— Таня, сколько же вас тут?

— Нас здесь четверо: муж, я и две дочки. А как мы тут очутились? Да очень просто, так же, как и все... Мы с мужем не минчане. Поженились (он к этому времени уже работал в столице), и нам, как иногородним, дали комнату. Это было в 1994 году. Время шло. Дети подросли. Места нам всем все больше не хватало. В конце концов, администрация общежития «нашла» выход — нас просто выселили... Я к тому времени только-только закончила медучилище, и мы получили комнату здесь. Да, она больше, чем предыдущая, но места все равно катастрофически мало. Мы с мужем начали просить, чтобы нам дали блок: двое детей все-таки растет. А нам в ответ: «Для того, чтобы получить целый блок, необходимо, чтобы вас было хотя бы пятеро...»

— И неужели государство никак не может помочь?

— Да разве оно может помочь, даже если очень захочет? Знаете, сколько таких, как мы? Всем не поможешь!.. Хочешь иметь собственную квартиру — доставай деньги и покупай, иначе становись на очередь и... К сожалению, с нашими финансами особо не разгонишься, только-только сводим концы с концами. Люди обычно стоят в очереди около тринадцати лет, затем нужно делать первый взнос (из своего карамана, все тринадцать лет экономя и отказывая себе даже в мелочах) и только после этого можно получить ссуду.

— Таня, помните, в кинофильме «Одиноким предоставляется общежитие» Наталья Гундарева сказала: «Вслушайтесь в слово «общежитие»: общее житье...» Похоже на правду?

— Конечно, похоже. Здесь же все общее. Одна кухня на целое крыло. В ней всего три плиты, у которых еще и конфорки не все работают. Раньше у нас и духовки не работали (видимо, в целях пожарной безопасности), но мы собрали деньги и одну отремонтировали. Так что теперь мы уже печь можем!

Если пойти чуть дальше по коридору, то там будет наша «кладовая» — место, куда сваливается до поры до времени ненужный хлам. Тут же находится наш балкон, до которого я уже и не мечтаю когда-либо добраться.

Плата за коммунальные услуги у нас тоже «общая» — на все общежитие один счетчик электроэнергии! Неважно, кто и сколько электроэнергии сожжет за месяц, показания счетчика делятся на количество проживающих в общежитии и умножаются на количество членов семьи. Представляете, сколько выходит, если нас четверо? Такой же порядок с оплатой за воду.

— Но есть ведь что-то и хорошее?..

— Да, конечно. Например, дети у нас у всех тоже «общие». Я имею в виду, что детишки носясь по коридору, запросто «заходят в гости» к любому и там всегда чувствуют себя, как дома. Пока мои были совсем маленькие, я могла попросить соседей посмотреть за ними, а сама спокойно сбегать по неотложным делам. И так выкручиваются все. Про детей мы здесь часто говорим «наш табун». Дело в том, что их всегда много, причем, в одном месте.

— А праздники вы когда-нибудь отмечаете вместе?

— А как же. Там, где мы жили раньше, нашими соседями по блоку была одна пара. Мы часто вместе встречали праздники. Здесь это тоже проходит довольно весело. Вот, например, на Новый год мы украсили гирляндами общий коридор, кухню. Потом вынесли туда чей-то магнитофон и гуляли всю ночь. Знаете, а ведь детям есть польза от такой «общей» жизни: они с малых лет находятся в коллективе, учатся общаться, помогать друг другу, защищать младшего и слабого. Конечно, бывает, что этот «табун» такое отчебучит!..

— В условиях «общей» жизни очень важен «соседский» фактор...


— Да, если соседи хорошие, дружелюбные, контактные, то и отдыхается всем вместе здорово, и за детей всегда спокойно. Не зря говорят, что хороший сосед — это как близкий родственник.

— Не думаете ли вы в ближайшем будущем переехать в собственную квартиру?

— Я уже говорила, что если бы были деньги, давно бы переехали. Слишком это дорого стоит. Мы не потянем. Но нам обещают блок в другом общежитии, правда, далеко отсюда, да и комнатки там поменьше. Зато две! Девчонкам нашим сразу одну отдадим! Инна в этом году идет в первый класс, так ей даже уроки негде пока делать. А так будет у них своя комната, кровать, стол!

— Представляете ли вы, Таня, свою будущую квартиру?

— Бывает, как начнешь думать, что и где будешь ставить, так остановиться не можешь! Так хочется, чтобы и ванна, и туалет свои были. Надоели уже эти очереди туда по утрам. Хочется, чтобы кухня была своя, чтобы там стояла красивая плита, которая бы исправно работала. Хочется чтобы холодильник был на нужном месте, а не в коридоре...



А дочки больше всего мечтают о собственной комнате, о своей, собственной кровати. Раньше они спали вместе. Теперь выросли, и им стало тесно. Всю ночь друг друга ногами пихают. Еще одну кровать поставить негде. Я решила, что одна из них будет спать на матрасе, на полу. Добровольно никто не хочет, ссорятся. Так я даже очередь установила...

Ладно, говорить обо всем этом можно до бесконечности, мы и так засиделись, чай уже давно готов...

Мы садимся за стол, на котором блюдо со свежими кексами. Рядом дымится только что разлитый по чашкам чай. И все это так похоже на домашний уют...

Ольга Самусик, для «БМ»

• Неправильная литература

Парад уродов Ирвина Уэлша

Если какой-нибудь Дэнни Бойл сейчас задается вопросом "А не экранизировать ли новый роман Ирвина Уэлша?", надеюсь, что этого не сделает ни он, ни кто-либо другой. Просто потому, что это лишь все испортит. Потому что с помощью видеоряда все равно не удастся передать ту атмосферу, которая подобно вирусу поражает мозг смиренного читателя.

В принципе, и никакие эпитеты тоже не помогут, чтобы хоть приблизительно описать произведение в обычной газетной рецензии. Определениями типа "задорный хулиганский драйв, брутальная стилистика" читатель сыт по горло, поскольку подобные ярлыки клеятся и на фильмы Тарантино, и на книги Ярика Могутина, и на альбомы группы ЛЕНИНГРАД. А обычная отписка никакого морального удовлетворения не принесет. Ладно, попробую доставить себе аморальное удовлетворение.

Итак, Ирвин Уэлш. Написал "Трэйнспоттинг" и "Кислотный дом" (все понятно, комментарии излишни). Повзрослевший британский подросток-люмпен, сумевший весьма точно зафиксировать во всемирной литературе такого же подростка-люмпена, сдав его потомкам со всеми потрохами, проблематикой и, что самое главное, с безошибочно точным диагнозом (ну, это чтобы потом другие люди над этим не бились, так он сразу: "Нате!") и методикой лечения. Молодежь Уэлша — жители захолустных периферийных населенных пунктов, считающие Эдинбург "жопой мира" (это они у нас не были), пьющие пиво, пялящие телок, заколбашенные рэйвом и психостимуляторами, выезжающие на футбольный матч с единственной целью: навешать кому-нибудь п...дюлей. Ну правильно — а какие еще развлечения могут быть в жопе мира?

В книге "Экстази" — очень, кстати, жестокой книге — нет положительных героев. Здесь все засранцы. Просто кто-то поставлен в такие условия, в которых вынужден быть... ну, немножко хуже, чем все остальные. Пожилая писательница, расправившаяся с мужем-ублюдком, сидит в чил-ауте, "закинутая" МДМА. Известный телеведущий трахает в морге трупы. Влюбленный в безрукую девушку гопник жестоко мстит за ее уродство. Замужняя девка, которой экстази окончательно сорвало башню, уходит к наркоману и бездельнику, изза любви к ней завязавшему с наркотиками. Ничего странного в этом нет. Мы тоже плохие. Мы это знаем. Но прочитать об этом у Уэлша — интереснее, чем просто знать.

Когда-нибудь, лет через тридцать, дурное время рэйва и XTC будет представляться людям чем-то сверхромантическим (как сейчас 60-е: хиппи, ЛСД, Грейтфул Дэд и т.д.), полным открытий и неземной философии. Человек будет читать Уэлша, как я сейчас читаю Керуака, и думать: "Раньше люди принимали наркотики для того, чтобы получить какую-то информацию, а сейчас все просто бессмысленно торчат". Все всегда бессмысленно торчали. Даже так любимый старшеклассницами Булгаков. И ни конца, ни края этому никогда не будет.

А. Галецкий, для "БМ"

Сакавіцкі каляндар

2 сакавіка

2 сакавіка 1562 году нарадзіўся беларускі вайскаводзец Крыштаф Мікалай Дарагастайскі. У тыя часы Беларусь была часткаю Вялікага Княства Літоўскага, і Дарагастайскі займаў у гэтай дзяржаве пасаду маршала. Ён удзельнічаў у Лівонскай вайне супраць Расеі ды ў вайне з швэдамі. Між іншым, Дарагастайскі займаўся ня толькі вайсковымі справамі. У 1615 годзе ён заснаваў друкарню ў маёнтку Ашмяна Мураваная.

2 сакавіка ў 1994 годзе Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прагаласаваў за прэзыдэнцкую форму кіраваньня краінай. Між іншым, апазыцыя ў тым галасаваньні ня ўдзельнічала. Быццам адчувалі, да чаго ўсё гэта ўрэшце прывядзе.

4 сакавіка

4 сакавіка 1634 году ў Лышчыцах пад Берасьцем нарадзіўся беларускі шляхціч Казімір Лышчынскі, які ў будучыні стане славутым мысьляром. Вучыўся Лышчынскі ў Берасьцейскім езуіцкім калегіюме і ў духоўнай акадэміі ў Кракаве. Нейкі час працаваў выкладчыкам, пасьля юрыстам, а ўрэшце падаўся ў палітыку — быў паслом ад Берасьця ў сойме Вялікага Княства. Пры тым Лышчынскі разважаў пра тое, як уладкаваны сьвет, і занатоўваў свае развагі на паперы. Ён марыў пра стварэньне грамадзтва роўнасьці й братэрства, жадаў бачыць "сьвет без улады, гарады без начальнікаў, народы без гаспадароў". Гэткай рэвалюцыйнай сьцяжынай Лышчынскі прыйшоў да атэізму. У свае 53 гады ён піша Трактат пра неіснаваньне Бога. Натуральна, 17 ст. было зусім ня той эпохай, калі атэістычныя выказваньні маглі рабіцца беспакарана. Лышчынскага зьняволілі, а ўрэшце соймавы суд прысудзіў яго да пакараньня сьмерцю. Філёзафа абезгаловілі, а пасьля спалілі на вогнішчы.

5 сакавіка

5 сакавіка ў 1896 годзе прыйшоў на сьвет самы савецкі беларускі пісьменьнік і навуковец Кандрат Крапіва, якога кожны беларус са школы ведае як таленавітага байкапісца.

5 сакавіка 1910 году нарадзіўся Аўген Калубовіч, гісторык, літаратуразнавец і палітык. Ягоны пакручасты лёс па-свойму тыповы для тагачасных беларускіх гуманітарыяў. Вучоба ў Менску, сталінскія рэпрэсіі, вяртаньне ў Беларусь, нямецкая акупацыя, эміграцыя. Як навуковец Калубовіч вызначыўся тым, што зьбіраў зьвесткі пра страчаныя помнікі беларускай культуры — разбураныя, спаленыя, зьнішчаныя.

7 сакавіка

7 сакавіка 1943 году савецкія партызаны расстралялі ў Менску беларускага палітыка Фабіяна Акінчыца. Акінчыц яшчэ з дарэвалюцыйных часоў браў чынны ўдзел у працы адраджэнскіх арганізацыяў і суполак, перад вайною быў старшынём дабрачыннага таварыства ў Беларускім нацыянальным камітэце ў Вільні.

І яшчэ адна падобная да папярэдняе дата. 7 сакавіка 1991 году хуліганы на адной менскай вуліцы забілі паэта Анатоля Грачанікава. На той момант Грачанікаў быў галоўным рэдактарам часопіса "Маладосьць".

Падрыхтаваў Ян Мацур, для "БМ"

(працяг будзе, захаваны правапіс арыгіналу)

"Беларуская маладзёжная"
Рэспубліканская грамадска-палітычная незалежная газета
Заснавальнік
Рэдакцыя газеты "Беларуская маладзёжная"
Рэдакцыйная калегія: А. Г. Пятроўская — загадчык аддзела інфармацыі, І.А. Слаўнікава — загадчык аддзела па сувязях з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі.

Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, друкаваць артыкулы дзеля палемікі

Адрас рэдакцыі:
220134, Мінск,
вул. Якубоўскага, 15-1-77
Кантактныя тэлефоны: 57-00-43, 20-98-04
E-mail:belmol@irex.minsk.by
Пасведчанне аб рэгістрацыі № 665
Пры передруку спасылка на "БМ" абавязковая

Падпісана ў друк 14 сакавіка 2002 г. у 14.30
Надрукавана з дыяпазытываў заказчыка ў паліграфічным УП "Светоч", 220073, г. Мінск, вул. Камуністычная, 14.

Кошт свабодны
Тыраж 3000 экз. Заказ № 408

Галоўны рэдактар
Т.І. Мельнічук
(Нічыпарук)

Падпісны індэкс
63309